*Спецыяльны выпуск*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

**Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 15 мая 2000 года, панядзелак.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# КАМІСІЯ ПА ЭТЫЦЫ

*У снежні мінулага года Вучоны савет зацвердзіў Палажэнні, якія без перабольшвання можна назваць эпахальнымі ў гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Створаны Аб'яднаны савет, якому пашчасціла 25 мая выбіраць рэктара, Камісія па этыцы, якой адведзена значная роля ў рэгуляванні універсітэцкага жыцця. Напярэдадні адзначаннай даты, калі, акрамя іншага, будуць прыведзены да прысягі члены Камісіі, з намі згадзіўся пагаварыць верагодны прэтэндэнт на тое, каб яе ўзначаліць, намеснік загадчыка кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі дацэнт Мікалай Іванавіч КАЗЛОЎСКІ.*



**— Мікалай Іванавіч, банальнае пытанне. Для чаго стваралася Камісія?**

— У такой вялікай установе, як БДУ, павінна быць нейкая структура, у пэўнай ступені незалежная ад адміністрацыі, якая рэгулявала б міжасабовыя адносіны ў творчым працэсе, выступала б з незалежнай экспертызай перад грамадскасцю. Для універсітэта асобае значэнне мае той дух, тая атмасфера, якія ствараюцца пакаленнямі супрацоўнікаў, перадаюцца ад выкладчыкаў студэнтам і разам з выпускнікамі пераносяцца ў грамадства. Я ўпэўнены, што сучасны універсітэт, а БДУ, безумоўна, з'яўляецца такім, не толькі рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія робяць навуковыя адкрыцці, але і складае новыя адносіны паміж людзьмі, усталёўвае ўзровень гэтых адносін. Камісія па этыцы павінна быць гарантам іх маральнай чысціні. Асноўныя яе задачы сфармуляваны ў Палажэнні. Але, я мяркую, што жыццё дабавіць яшчэ шмат чаго. Дарэчы, члены Камісіі маюць немалыя паўнамоцтвы і гарантыі...

**— Як фарміруецца склад гэтай прадстаўнічай структуры?**

— У Камісіі павінна быць 9 чалавек. 6 прадстаўнікоў з прафесарска-выкладчыцкага саставу, 2 — ад калектыву навуковых супрацоўнікаў, 1 — ад прафсаюзнай арганізацыі. Трапіць у яе даволі складана. Не выпадкова, што ў нас павінны адбыцца давыбары па адной кандыдатуры ад прафесарска-выкладчыцкага саставу. Колькасць пададзеных галасоў за таго ці іншага кандыдата павінна складаць 3/4 ад удзельнікаў галасавання. Гэта, я лічу, правільна. Такі высокі бар'ер можа пераадолець толькі сумленны і паважаны чалавек.

**— Па ўсяму відаць, Камісіі надаецца вельмі высокі статус?**

— Так, згодна з Палажэннем аб Аб'яднаным савеце, старшынёй яго з'яўляецца рэктар, а намеснікам — кіраўнік Камісіі па этыцы. А ў адпаведнасці з Палажэннем аб выбранні рэктара, Камісія каардыніруе перадвыбарную кампанію.

**— Раскажыце, калі ласка, як праходзіць гэтая кампанія?**

— Дынамічна і ў большай ступені прадказальна. Не меней як за 20 дзён да галасавання вучоныя саветы структурных адзінак універсітэта правялі вылучэнне кандыдатаў, ці лепей было б сказаць — кандыдата. Яны амаль аднагалосна назвалі прозвішча Аляксандра Уладзіслававіча Казуліна. Такім чынам калектыў пацвердзіў, што працай рэктара ён задаволены.

**— Па выніках перадвыбарнай кампаніі Камісія павінна прадставіць на гэты конт сваё заключэнне. Што ў ім будзе?**

— Гэта будзе невялікі дакумент, які дапаможа членам Аб'яднанага савета, якіх болей за 500, скласці сваё меркаванне наконт вылучанага кандыдата. У ім будуць прадстаўлены як тэхнічныя вынікі, так і матывацыя вылучэння кандыдата.

**— Наколькі дэмакратычныя, на ваш погляд, сістэма вылучэння кандыдатаў і выбары?**

— Тое, што мы назіраем, вялікі крок да дэмакратычнасці. Заўсёды універсітэцкае жыццё з'яўлялася скарбонкай перадавых дэмакратычных ідэй. Сённяшні дзень, як бачым, не з'яўляецца выключэннем. Дарэчы, само стварэнне Камісіі па этыцы — яскравы прыклад таго. А чаго вартая тайна вызначэння свайго меркавання на ўсіх этапах выбараў ад вылучэння кандыдатаў да галасавання!

**— Ці ёсць нейкія асаблівасці ў маючых адбыцца выбарах з тэхнічнага боку?**

— Працэдура галасавання з'яўляецца звычайнай і знаёмай для яе ўдзельнікаў. Паколькі кандыдат толькі адзін, то прапанавана форма бюлетэня, падобная на любую з тых, якой карыстаюцца пры выбарах кагосьці, хто праходзіць конкурс. Галасаванне адбываецца так. Калі чалавек галасуе за кандыдата, то кідае ў скрыню бюлетэнь без аніякіх паметак. Калі чалавек супраць, то прозвішча кандыдата перад укіданнем бюлетэня ў скрыню закрэсліваецца. Каб захаваць тайну галасавання, прапанавана праводзіць яго праз індывідуальныя кабіны. Непасрэдна тэхнічныя праблемы ў дзень галасавання будзе вырашаць выбраная Аб'яднаным саветам падліковая камісія.

**— Раскажыце напрыканцы, чым будзе займацца Камісія па этыцы цэлых 7 гадоў тэрміну сваіх паўнамоцтваў?**

Працуем мы яшчэ зусім нядаўна. Пералік праблем толькі акрэсліваецца. Але мы гатовы дапамагчы вырашыць любыя канфлікты, якія ўзнікаюць паміж супрацоўнікамі, супрацоўнікамі і адміністрацыяй на глебе арганізацыі працы, творчага, навуковага працэсаў. Права звярнуцца да нас мае любы член універсітэцкага калектыву. Рашэнне па ўсялякіх пытаннях прымаецца Камісіяй толькі на аснове кансенсуса. Хачу дадаць, мы не будзем займацца тымі справамі, якія рэгулююцца існуючым заканадаўствам.

# ВЫБАР БУДУЧЫНІ

*25 мая ў актавай зале Беларускага дзяржаўнага універсітэта пройдзе пасяджэнне Аб'яднанага савета БДУ, на якім будзе абраны рэктар універсітэта.*

Як нам паведаміў Мікалай Іосіфавіч Юрчук, выконваючы абавязкі сакратара Аб'яднанага савета, а дзевятай гадзіне пачнецца рэгістрацыя членаў Савета, сам жа Савет распачне сваю працу ў 10 гадзін 15 хвілін.

Усім членам Аб'яднанага савета (а гэта ўсе члены вучоных саветаў БДУ, факультэтаў, падраздзяленняў, кіраўнікі структурных падраздзяленняў, прадстаўнікі працоўных калектываў) напярэдадні будуць дасланы запрашэнні з указаннем даты, месца і часу правядзення пасяджэння, парадку дня і іншай карыснай інфармацыяй.

У парадку дня, акрамя выбараў рэктара, стаіць яшчэ нямала важных пытанняў: зацвярджэнне Палажэння аб Аб'яднаным савеце БДУ, прывядзенне да прысягі членаў Камісіі па этыцы, абранне старшыні гэтай камісіі, абранне сакратара Аб'яднанага савета, зацвярджэнне геральдыкі БДУ.

Камісіяй па этыцы 10 мая былі ўстаноўлены ўзоры бюлетэняў для тайнага галасавання. Для забеспячэння тайнасці галасавання на чацвёртым паверсе галоўнага корпуса будуць усталяваны кабіны.

На сённяшні дзень на пасаду рэктара вылучаны адзін кандыдат: Аляксандр Уладзіслававіч Казулін. Каб быць абраным, Аляксандру Уладзіслававічу дастаткова набраць простую большасць галасоў пры кворуме 2/3 ад усёй колькасці членаў Аб'яднанага савета.

Мікалаю Іванавічу Казлоўскаму, які вылучаны на пасаду старшыні Камісіі па этыцы, будзе крышку цяжэй: яму трэба набраць 3/4 галасоў ад колькасці прагаласаваўшых.

КАНДЫДАТ НА ПАСАДУ РЭКТАРА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

# КАЗУЛІН АЛЯКСАНДР УЛАДЗІСЛАВАВІЧ

*Вылучаны вучонымі саветамі геаграфічнага, механіка-матэматычнага, філалагічнага, біялагічнага, гістарычнага, хімічнага, фізічнага факультэтаў, факультэтаў кіравання і сацыяльных тэхналогій, радыёфізікі і электронікі, філасофіі і сацыяльных навук, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, журналістыкі, міжнародных адносін, Навукова-даследчай часткі, вучэбна-адукацыйнай установы "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы", НДІ фізіка-хімічных праблем, НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Сеўчанкі Белдзяржуніверсітэта, а таксама рэкамендаваны Аб'яднанаму савету для выбрання на пасаду рэктара прафсаюзным камітэтам, Саветам стараст, камітэтам Студэнцкага саюза БДУ.*



Нарадзіўся 25 лістапада 1955 года ў Мінску.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1972 годзе ў якасці школьнага лабаранта. У той жа час паступіў на вячэрняе аддзяленне матэматычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Пасля службы ў марской пяхоце пайшоў працаваць у кавальскі корпус Мінскага трактарнага завода. У 1976 годзе пераведзены на дзённае аддзяленне механіка-матэматычнага факультэта БДУ, які выдатна скончыў у 1980 годзе.

З 1980 да 1988 года, працуючы ва універсітэце, прайшоў шлях ад выкладчыка-стажора да дэкана...

У 1986 годзе абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

З 1988 да 1996 года працаваў у Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь на пасадах начальніка аддзела перспектыўнага развіцця і інфармацыі — памочніка міністра адукацыі, начальніка вядучага аддзела бесперапыннай адукацыі і перспектыўнага развіцця, намесніка, першага намесніка міністра адукацыі.

У 1995 годзе абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук у Маскоўскім педагагічным універсітэце.

З верасня 1996 года з'яўляецца рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1997 годзе абраны прафесарам.

Правадзейны член, віцэ-прэзідэнт Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў. Віцэ-прэзідэнт Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў.

Аўтар 7 манаграфій, больш за 50 навуковых артыкулаў.

Прымаў удзел у якасці аднаго з кіраўнікоў творчых калектываў па распрацоўцы Закона аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, Канцэпцыі адукацыі і выхавання, Канцэпцыі нацыянальнай школы Рэспублікі Беларусь.

Сфера навуковых інтарэсаў — сістэма кіравання адукацыяй, педагагічныя асновы арганізацыі вучэбных устаноў новага тыпу, інавацыйныя працэсы ў сферы адукацыі.

Жонка — выпускніца механіка-матэматычнага факультэта БДУ. Працуе ў Цэнтры праблем чалавека універсітэта. Старэйшая дачка — студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта БДУ, малодшая — школьніца.

## *Аб кіраўніку судзяць па яго справах*

Прафесар А.У. Казулін праводзіць вялікую працу па ўдасканаленні універсітэцкай адукацыі, развіцці фундаментальных і прыкладных НДР, міжнародных сувязей і прэстыжу БДУ. З'яўляецца выдатным вучоным у галіне праблем педагогікі вышэйшай адукацыі, распрацоўкі новых метадаў і тэхналогій навучання. Вялікую ўвагу надае развіццю новых вучэбных спецыяльнасцей, умацненню іх навукова-метадычнай базы, стварэнню неабходных сацыяльных умоў для працы выкладчыкаў.

*З пратакола пасяджэння Вучонага савета геаграфічнага факультэта ад 25.04.2000 г.*

Аб кіраўніку судзяць па яго справах. Новы статус універсітэта, паляпшэнне сацыяльных умоў прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў, будаўніцтва і рэканструкцыя вучэбных карпусоў і інтэрнатаў, абнаўленне матэрыяльнай базы, адкрыццё новых спецыяльнасцей, кампьютэрызацыя — усё гэта праца рэктара і рэктарата, якіх падтрымлівае калектыў.

*З пратакола пасяджэння Вучонага савета механіка-матэматычнага факультэта ад 27.04.2000 г.*

За 3 гады працы рэктара А.У. Казуліна ва універсітэце адбыліся вялікія перамены, якія адчуваюцца цалкам па БДУ і па факультэтах у прыватнасці. Рэктар паказаў сябе выдатным арганізатарам, мабільным, патрабавальным адміністратарам. Ні адно пытанне ці ініцыятыва, прапанаваныя факультэтам журналістыкі, не заставаліся без увагі кіраўніцтва. Заўсёды мы адчувалі падтрымку рэктара ў нашых пачынаннях: адкрыцці новых кафедр, спецыяльнасцей...

*З пратакола пасяджэння Вучонага савета факультэта журналістыкі ад 3.05.2000 г.*

## *Істотнасць змен, важкасць задум і дзеянняў*

*Абгрунтаванне вылучэння на пасаду рэктара Белдзяржуніверсітэта Вучоным саветам гістарычнага факультэта*

Вучоным саветам гістарычнага факультэта 3 мая на пасаду рэктара Белдзяржуніверсітэта аднагалосна была вылучана кандыдатура Казуліна Аляксандра Уладзіслававіча. Члены Вучонага савета пры абмеркаванні пытання прыйшлі да высновы, што за апошнія гады, калі універсітэт узначальваў А.У. Казулін, адбыліся відавочныя змены амаль на ўсіх кірунках дзейнасці. Белдзяржуніверсітэтператварыўся ў сапраўдны адукацыйны і навуковы цэнтр суверэннай Беларусі, самым істотным чынам аднавілася матэрыяльна-тэхнічная забяспечанасць яго дзейнасці. Нельга не адзначыць і клопаты кіраўніцтва універсітэта аб матэрыяльным стымуляванні працы выкладчыкаў, навукоўцаў і супрацоўнікаў, аб усталяванні ва універсітэцкім калектыве адносін творчасці, добразычлівасці, імкнення да прафесійнага росту і адданасці сваёй alma mater.

Істотнасць гэтых змен і важкасць задум і дзеянняў, разлічаных на перспектыву, тым больш відавочныя, калі мець на ўвазе складанасць перыяду, які перажывае наша краіна. Ва ўсіх пазітыўных зменах, якія адбыліся і адбываюцца ў БДУ, галоўная роля належыць яго рэктару. Таму вылучэнне кандыдатуры Аляксандра Уладзіслававіча да абрання на пяцігадовы тэрмін на пасаду рэктара БДУ адпавядае рэчаіснасці, дае магчымасць рэалізаваць ва універсітэце тое, што ім запланавана, што адпавядае стратэгіі універсітэцкага развіцця.

*Дэкан гістарычнага факультэта дацэнт А.А. ЯНОЎСКІ.*

# Нацыянальны універсітэт

Сёння БДУ сапраўды нацыянальны універсітэт. Ён у поўнай меры адпавядае еўрапейскім і сусветным стандартам класічнага універсітэта. Сведчанне таму — прызнанне дыплома БДУ ў ЗША, Германіі, Францыі, Ізраілі і іншых краінах.

У сістэме БДУ навучаецца больш за 16 тыс. студэнтаў, у тым ліку каля 12 тыс. на стацыянары, 650 аспірантаў і дактарантаў, працуе 6,7 тыс. супрацоўнікаў, сярод якіх больш за 2 тыс. выкладчыкаў і каля 900 навуковых супрацоўнікаў, з іх — больш за 300 дактароў навук і больш за 1400 кандыдатаў навук. У 1999 годзе супрацоўнікамі БДУ абаронена 14 доктарскіх і 60 кандыдацкіх дысертацый.

У БДУ інтэнсіўна развіваецца навукова-інавацыйная дзейнасць. Навукова-вытворчая сфера аб'ядноўвае 6 прадпрыемстваў, у тым ліку такія унікальныя для нашай краіны, як "Унидрагмет" — манапольны вытворца прадукцыі, якая ўтрымлівае каштоўныя металы, "Унитехпром" — вытворца высокатэхналагічнай хімічнай прадукцыі і вымяральных прыбораў. У выніку навукова-вытворчай дзейнасці БДУ штогод эканомія дзяржбюджэтных сродкаў складае не менш як 3 — 4 млн долараў ЗША.

Белдзяржуніверсітэтам заключаны буйныя пагадненні аб супрацоўніцтве ў сферы навукова-тэхналагічнага забеспячэння і вытворчасці інтэлектуальнаёмістай прадукцыі, мэтавай падрыхтоўкі кадраў з 14 вядучымі галіновымі міністэрствамі і шэрагам буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў, сярод якіх Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства па надзвычайных становішчах, Міністэрства фінансаў, Міністэрства замежных спраў, Нацыянальны банк, Беларуская чыгунка, "Беларуськалий", ПО "Азот", гродзенскае ПО "Хімвалакно", ПО "Інтэграл" і іншыя.

Белдзяржуніверсітэт на працягу дзесяцігоддзяў з'яўляецца буйным пастаўшчыком кадраў для навуковых устаноў. Не менш як 80 працэнтаў супрацоўнікаў Нацыянальнай акадэміі навук, уключаючы вышэйшае кіраўніцтва, — выпускнікі БДУ.

# Будоўля і рэканструкцыя

Белдзяржуніверсітет знаходзіцца ў стане пастаяннай будоўлі і рэканструкцыі.

У 1997 годзе былі пачаты работы па рэканструкцыі комплексу будынкаў універсітэцкага гарадка, праводзіліся работы па яго ўпарадкаванню.

У 1998 годзе ўведзены ў эксплуатацыю адміністрацыйны корпус па вуліцы Бабруйскай, інтэрнат на 1000 месцаў. Скончана праектаванне Браслаўскага вучэбна-навукова-экалагічнага цэнтра і пачата яго будаўніцтва. Пачаліся і актыўна вядуцца работы па рэканструкцыі галоўнага корпуса універсітэта.

На баланс БДУ перададзены будынак незавершанага будаўніцтва па вуліцы Кальварыйскай. Зараз зроблены праект па перапрафіляванню будынка пад навукова-вучэбна-даследчы комплекс. У недалёкай будучыні там размесцяцца факультэты філасофіі і журналістыкі, выдавецкі цэнтр, тэле-радыё-цэнтр.

Заканчваюцца будаўніча-мантажныя работы ў вучэбна-лабараторным корпусе біялагічнага факультэта. Пад час працы былі ўнесены карэкціроўкі ў праект з улікам сучасных патрабаванняў да вучэбнага працэсу і лабараторнага забеспячэння.

Пачата будаўніцтва вучэбна-лабараторнага корпуса хімічнага факультэта і НДІ фізіка-хімічных праблем. Праектам прадугледжана стварэнне вопытнай вытворчасці з тэхналогіямі, якім няма аналагаў у СНД.

У верасні гэтага года будзе скончана рэканструкцыя вуліцы Курчатава, што дазволіць забяспечыць нармальныя транспартныя зносіны універсітэцкага гарадка ў п. Шчомысліца з цэнтрам горада, а таксама добрыя ўмовы забеспячэння вадой, цяплом, электраэнергіяй.

На чарзе — рэканструкцыя спальнага корпуса дома адпачынку "Нарач". Белдзяржуніверсітэт будзе мець свой санаторый.

Выкананы архітэктурны праект рэканструкцыі універсітэцкага гарадка. Тут паўстане будынак факультэта міжнародных адносін. Плануецца пачаць будаўніцтва новага будынка фундаментальнай бібліятэкі, які будзе адпавядаць сусветным стандартам.

Распрацаваны эскізны праект культурна-спартыўнага комплексу ў цэнтры горада на плошчы ў 18 гектараў. Там будуць: лёгкаатлетычны манеж, басейн, аквапарк, спартыўныя залы, пляцоўкі для вялікага тэнісу, маладзёжны цэнтр, тэатр, музейныя памяшканні...

# Міжнародныя сувязі

У 1996 — 1998 гадах Белдзяржуніверсітэт прыняў актыўны ўдзел у рэалізацыі праграмы ТЕМПУС Еўрапейскага саюза з агульнай сумай фінансавання каля 2 млн долараў ЗША. Ажыццяўленне гэтых праектаў дазволіла адкрыць у БДУ новыя спецыяльнасці, набыць сучаснае абсталяванне, накіраваць на стажыроўку за мяжу больш за 150 супрацоўнікаў.

Спецыялісты універсітэта ўдзельнічаюць ў розных праграмах навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, што дазваляе прыцягваць дадатковыя сродкі для фундаментальных і прыкладных даследаванняў. Так, напрыклад, для выканання кантрактаў з замежнымі партнёрамі (ІНТАС-КАПЕРНІКУС, МАГАТЭ, Франка-германская ініцыятыва па Чарнобылю, ТАСІС) з 1998 па 2000 год узгоднена выдзяленне больш за 1 млн долараў ЗША.

За тры апошнія гады універсітэт наладзіў актыўнае і плённае супрацоўніцтва з шэрагам вядучых міжнародных арганізацый, сярод якіх: ААН/Праграма развіцця, ЮНЕСКА, Еўрапейская камісія, Савет Еўропы.

Значна пашырылася геаграфія партнёрскіх сувязей. Акрамя існаваўшых пагадненняў з ВНУ Польшчы і Германіі, былі заключаны дамовы з універсітэтамі Расіі, Украіны, Малдовы, Арменіі, Азербайджана, Літвы, Латвіі, Швецыі, Францыі, Іспаніі, Італіі, Грэцыі, Чэхіі, ЗША, Сірыі, Кітая, Японіі.

Заключаныя з замежнымі партнёрамі пагадненні прадугледжваюць накіраванне ў БДУ на вучобу (падрыхтоўчы факультэт і інтэрліцэй) штогод да 200 чалавек. З улікам навучэнцаў на асноўных факультэтах, а таксама ў аспірантуры і дактарантуры, колькасць іншаземцаў у бліжэйшыя гады можа дасягнуць 600 — 800 чалавек. Аплата за іх навучанне складзе 1,5 млрд амерыканскіх долараў.

Белдзяржуніверсітэт — не толькі цэнтр навукі і культуры, але буйны навукова-вытворчы комплекс. Напрыклад, сёння прапрацоўваецца маркетынгавая частка праекта па вытворчасці сумесна з нямецкай фірмай "Бекер" лёгкіх пад'ёмных прыладаў. Пачата прапрацоўка праекта па вытворчасці аб'ёмістых халадзільных камер. Праведзены перамовы з АО "Іенафарм" па стварэнні фармацэўтычнай вытворчасці. У наяўнасці двухбаковая зацікаўленасць у сумеснай вытворчасці тэхнічнага шкла з прадпрыемствам "Шот"...

# НАВУКА

*Беларускі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца не толькі буйнейшым адукацыйным цэнтрам Рэспублікі Беларусь, але і адным з самых буйных навуковых цэнтраў. У склад універсітэта, акрамя факультэтаў, уваходзяць 4 навукова-даследчыя інстытуты, 2 цэнтры, якія маюць статус інстытутаў, а таксама створана інфраструктура навукова-вытворчай дзейнасці.*

БДУ з'яўляецца адзінай самадастатковай навуковай арганізацыяй (уласная падрыхтоўка кадраў высокай і вышэйшай навуковай кваліфікацыі; сферы фундаментальных даследаванняў як падмурак працэсу вышэйшай навуковай адукацыі і прыкладных навуковых распрацовак; сфера навукова-інавацыйнай (навукова-вытворчай, навукова-камерцыйнай) дзейнасці).

БДУ з'яўляецца адначасова і буйнейшай навуковай арганізацыяй і носьбітам шэрагу функцый органа дзяржаўнага кіравання ў навуковай і навукова-тэхнічнай галіне. Гэта забяспечвае хуткую рэалізацыю кіраўніцкіх рашэнняў у практыцы навуковай дзейнасці і хуткае ўспрыманне сістэмай кіравання прапаноў і рэкамендацый саміх суб'ектаў навуковай і навукова-інавацыйнай дзейнасці.

БДУ з'яўляецца адной з найбольш дынамічных навуковых арганізацый у выніку пастаяннага і значнага прытоку маладых навуковых кадраў.

У працэсе падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі забяспечаны рост колькасці абарон доктарскіх і асабліва кандыдатскіх дысертацый. Сістэматычна павялічваецца набор у аспірантуру, значна ўзрасла лічба і ўдзельная вага аспірантаў, якія скончылі навучанне з абаронай у тэрмін. У студэнтаў і аспірантаў з'явілася магчымасць па конкурсе атрымаць гранты для выканання навуковых праектаў.

За кошт паслядоўнага развіцця навукова-інавацыйнай дзейнасці на працягу трох апошніх год забяспечана ўстойлівая тэндэнцыя да рэальнага росту аб'ёму фінансавання навуковай сферы Белдзяржуніверсітэта, у тым ліку дзярждагаворнага фінансавання.

# БЕЛАРУСКІ — ТОЛЬКІ АДЗІН

*Напярэдадні выбараў рэктара БДУ людзі, жыццё якіх цесна звязана з універсітэтам, адказалі на два пытанні, якія тычацца мінулага і будучага вядучай навучальнай установы краіны. Пытанні былі наступныя: 1. Якія перамены ў жыцці універсітэта за апошнія гады вам найбольш запомніліся? 2. Якіх перамен вы чакаеце ў бліжэйшай будучыні?*

**Вячаслаў ЖЫЛКО, студэнт 3 курса хімічнага факультэта, стараста:**

1. Я ўважліва сачу за студэнцкім жыццём і бачу, што яно змяняецца. Вядома ж, у лепшы бок. Добра, што ў апошнія гады студэнтам стала ўдзяляцца больш увагі, больш праводзіцца агульнауніверсітэцкіх мерапрыемстваў...

Падабаецца вучыцца ў навучальнай установе, якая мае шмат планаў і паступова рэалізоўвае іх. Універсітэт відавочна шырыцца, будуецца, расце. Прыкладаў нямала: у хуткім часе з'явіцца асобны сучасны будынак для бібліятэкі, зараз пачынаюць будаваць новы корпус хімічнага факультэта...

Гэта і не дзіўна — БДУ атрымала асаблівы, міністэрскі статус.

2. Хацелася б, каб універсітэт больш надаваў увагі міжнародным кантактам, да прыкладу, запрашаў да нас выкладаць навукоўцаў з іншых краін свету. Трэба, каб БДУ быў лідэрам не толькі сярод навучальных устаноў на Беларусі, але і ўзняўся да ўзроўню буйнейшых універсітэцкіх цэнтраў, як МДУ напрыклад.

**Іван Іванавіч САЧАНКА, загадчык кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры, доктар гістарычных навук, прафесар:**

1. За апошнія тры гады універсітэт змяніўся да непазнавальнасці. Можна шмат пра што гаварыць, але я вылучу два моманты.

Па-першае, узрасла колькасць новых кафедраў, спецыяльнасцей і спецыялізацый. Возьмем, да прыкладу, факультэт журналістыкі: тры гады таму ў нас была толькі адна спецыяльнасць —журналістыка. Зараз дадаліся яшчэ тры: міжнародная журналістыка, інфармацыя і камунікацыя і літаратурнае рэдагаванне. Практычна падвоілася колькасць кафедраў. Толькі ў мінулым годзе на факультэце пачалі працаваць тры новыя. Амаль у два разы павялічыўся набор студэнтаў на факультэт (на дзяржаўным бюджэце — з 50 да 95 чалавек).

Па-другое, тое, што могуць заўважыць не толькі выкладчыкі і студэнты, але і кожны, хто пабываў ва універсітэцкім гарадку, — гэта чысціня, кветкі, клумбы, сучасны дызайн будынкаў... Мне давялося бываць у навучальных установах Германіі і іншых еўрапейскіх краін і хачу запэўніць, што цяпер наш універсітэт у гэтым сэнсе не саступае лепшым ВНУ свету.

2. Хочацца, каб кіраўніцтва універсітэта не спынялася на дасягнутым, таму што шмат чаго яшчэ трэба зрабіць. Ведаеце, ёсць універсітэт маскоўскі, кіеўскі, санкт-пецярбургскі, бярлінскі, сарбонскі, але беларускі універсітэт — падкрэсліваю слова **беларускі** — толькі адзін. Маю на ўвазе, што з самага заснавання універсітэта планавалася, што ўсе дысцыпліны будуць выкладацца на роднай мове. Зараз павялічваюцца гадзіны на вывучэнне англійскай, нямецкай, французскай моў. А хацелася б, каб беларускі універсітэт апраўдваў сваю назву на справе.

**Яўген Сямёнавіч ВАРАПАЙ, загадчык кафедры фізікі і спектраскапіі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар:**

1. Найбольш кардынальныя перамены, якія нельга не заўважыць, тычацца знешняга аблічча універсітэта. Асабліва ўражвае вельмі шырокі фронт работ па капітальнаму будаўніцтву і мадэрнізацыі карпусоў і будынкаў. Нічога параўнальнага не было з часоў рэктарства А.М. Сеўчанкі (1960 — 1970 гг.). Думаю, што такі шырокі фронт работ гаворыць аб наяўнасці перспектыўнай і прадуманай праграмы пераўладкавання універсітэта.

Другая, знешне менш прыметная, але не менш значная перамена — гэта тэндэнцыя да павелічэння конкурсу пры паступленні на прыродазнаўчыя факультэты.

2. Па натуры я аптыміст, і таму чакаю толькі пазітыўных змен ва універсітэце. Гэта вынікае з наступнага. Узровень і перспектыву любой ВНУ вызначаюць кадры і вучэбна-навуковая матэрыяльная база. Кадры ў нас самага высокага ўзроўню. Аб'ектыўным падцверджаннем гэтага з'яўляецца, у прыватнасці, і вельмі высокі ўзровень падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Дарэчы, гэта паставіла вельмі сур'ёзную, патрабуючую вырашэння на дзяржаўным узроўні праблему адтоку маладых спецыялістаў у вучэбна-навуковыя цэнтры краін далёкага замежжа. Думаю, што высокі прафесіянальны ўзровень выкладчыцкага калектыву, нягледзячы на пэўныя праблемы ўзроставага саставу, усё ж такі захаваецца. Таму асноўным фактарам, які вызначае ўзровень адукацыі ва універсітэце, можа стаць вучэбна-навуковая база. Гэтую праблему па сваёй складанасці можна параўнаць з праблемай капітальнага будаўніцтва. З вялікай надзеяй ацэньваю першыя крокі ў гэтым напрамку. Маю на ўвазе прынятую Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхніцы для фінансавання са сродкаў бюджэту праграму па стварэнні вучэбнага абсталявання для фізічных спецыяльнасцей універсітэтаў.

**Спецвыпуск падрыхтаваны прэс-службай Беларускага дзяржаўнага універсітэта і рэдакцыяй газеты "Беларускі універсітэт".**

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад**

**Загадчыкаў кафедраў:** інфарматыкі, радыёфізікі, вышэйшай матэматыкі, беларусазнаўства, усходніх моў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў.

**Прафесараў кафедраў:** дыферэнцыяльных ураўненняў, рускай мовы, паліталогіі, псіхалогіі.

**Дацэнтаў кафедраў:** тэарэтычнай фізікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, агульнай фізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, ядзернай фізікі, фізікі, матэматычнай фізікі, вышэйшай матэматыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцей, тэорыі функцый, ураўненняў матэматычнай фізікі, арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў, фізічнай хіміі, эканамічных навук, банкаўскай і фінансавай эканомікі, менеджменту, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, прыкладной лінгвістыкі, рамана-германскіх моў, гісторыі беларускай літаратуры, рускай літаратуры, гісторыі беларускай мовы, рускай мовы, замежнай літаратуры, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, крыніцазнаўства і музеязнаўства, гісторыі філасофіі і культуры, міжнародных адносін, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі,

**Старшых выкладчыкаў кафедраў:** методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, фізікі цвёрдага цела, тэхналогіі праграміравання, функцыянальнага аналізу, тэорыі функцый, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, эканамічнай геаграфіі замежных краін, дынамічнай геалогіі, рамана-германскіх моў, рускай мовы, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, класічнай філалогіі, крыніцазнаўства і музеязнаўства, крымінальнага права, сацыяльнай камунікацыі, філасофіі і метадалогіі навукі, гісторыі філасофіі і культуры, усходніх моў, англійскай мовы, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў.

**Выкладчыкаў кафедраў:** агульнага землязнаўства, эканамічных навук, менеджмента, рамана-германскіх моў, беларусазнаўства, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, гісторыі Расіі, археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, сацыяльнай камунікацыі, усходніх моў, дыпламатычнай і консульскай службы, рамана-германскіх моў, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, нямецкай мовы.

**Асістэнтаў кафедраў:** энергафізікі, агульнай фізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, радыёфізікі, тэхналогіі праграміравання, лікавых метадаў і праграміравання, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, аналітычнай хіміі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, Упраўленне кадраў, т. 226-59-39.

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады:**

малодшага навуковага супрацоўніка Навукова-наследчай лабараторыі беларускага фальклору і дыялекталогіі — 1.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Звяртацца на адрас: 220050, г. Мінск, Белдзяржуніверсітэт, вул. Бабруйская, 9, Навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 407.

Тэл. 226-47-64.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

*Ум. друк. арк. 1*

*Падпісана да друку ў 12.00*

*15 мая Зак. 360у. Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 206-61-43.*

**Рэдактар выпуска І. ЧАРТКОЎ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Яўгена Балаша*